**«ЕВА́НГЕЛЛЕ ВУЧЫ́ЦЕЛЬНАЕ»**, помнік старажытнага кнігавыдання. Надрукавана І.Фёдаравым і П.Мсціслаўцам у 1569 на сродкі гетмана Р.А.Хадкевіча ў яго маёнтку ў Заблудаве (цяпер Польшча). У пачатку змешчана вял. прадмова, напісаная на царкоўнаслав. мове самім Р.А.Хадкевічам. Назва — «вучыцельнае» або «нядзельнае» — паходзіць ад шэрагу (тыпу) падобных кніг, змест якіх прызначаўся для «павучэння ізбранна от святого Евангелія и от многих божественных писаній <...> ва ўсялякую нядзелю». «Е.в.» было папулярным у ВКЛ. Пасля заблудаўскага выдання наступнымі былі 3 віленскія — В.Гарабурды (каля 1580) і 2 — Мамонічаў (1595). Яны запазычылі з «Е.в.» (1569) шрыфты, размяшчэнне тэксту і арнаментацыю. У 1616 два выданні «Е.в.» выпусціла *Еўінская друкарня.* Першае мае прадмову, напісаную М.Сматрыцкім на старабел. мове і звернутую да крычаўскага старасты Б.Саламярэцкага, другое прысвечана княгіні Г.Хад-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

кевіч і падпісана манахамі брацкага манастыра. У 1569—1616 выдадзена некалькі тысяч асобнікаў «Е.в.». У 1790 у Супраслі і ў 1794 у Вільні паводле замовы старавераў здзейснена перавыданне маскоўскага Евангелля (1652).

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова